

Download



"Вясна" назірае

❗Сям'ю затрымалі супрацоўнікі КДБ, а асудзілі за непадпарадкаванне супрацоўнікам РУУСа

22 ліпеня супрацоўнікі КДБ затрымалі амаль усю сям'ю: **66-гадовую Таццяну Шчасную, 64-гадовага Сяргея Анановіча і 29-гадовага Яна Анановіча.** Быў праведзены ператрус у іх кватэры і на лецішчы. Пасля допыту ў КДБ усіх адвезлі ў Савецкае РУУС, дзе склалі пратаколы **па арт. 24.3 КаАП.** Згодна з пратаколам, яны аказалі непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі на тэрыторыі РУУСа: упіраліся нагамі і рукамі, адмаўляліся выходзіць з аўтамабіля.

Справы ўсіх членаў сям'і 23 ліпеня разглядзелі **суддзі Савецкага раёна Сяргей Шаціла і Аляксандр Волк.**

⚖**Яна Анановіч**а, па яго словах, наогул адразу не затрымлівалі. Супрацоўнікі КДБ прапанавалі прыехаць хлопцу дадому да бацькоў, каб аддаць ім ключы ад кватэры, у якой павінен быў адбыцца ператрус. Пасля ператрусу Яна разам з бацькамі адвезлі ў КДБ, дзе дапыталі ў якасці сведкі, а затым перавезлі ў Савецкае РУУС. Там, па словах сведкі-міліцыянта, ён і "здзейсніў правапарушэнне". Міліцыянт на судзе пацвердзіў непадпарадкаванне. Суддзя Шаціла прызнаў Яна вінаватым і арыштаваў яго на **10 сутак.**

⚖**Сяргея Анановіча** судзіў таксама **суддзя Шаціла**. Сваю віну мужчына не прызнаў, бо сцвярджае, што выйшаў са службовай машыны па першаму патрабаванню. У сваіх паказаннях ён пацвердзіў усе словы сына. Сяргей даглядае сваю 86-гадовую маці, якая знаходзіцца ў цяжкім стане з-за кавіда, таму суддзя аштрафаваў Сяргея на **2900 рублёў (100 базавых велічыняў).**

⚖Найбольш жорсткае пакаранне вынеслі **Таццяне Шчаснай**, справу якой разглядзеў **суддзя Аляксандр Волк**. Жанчына на судзе заявіла, што гэта ўсё няпраўда і суддзя гэта павінень разумець. Са словаў Таццяны, яна дабраахвотна выйшла са службовай машыны і прайшла ў РУУС. Сведка "Любімаў" на судзе сцвярджаў, што жанчыну затрымалі для "высвятлення асобы", а ва дворыку адмовілася прайсці за ім. Відэакамеры ў двары РУУСа, вядома, не працавалі. У выніку, разглядзеўшы справу за 15 хвілін, **суддзя Волк** арыштаваў **Шчасную** на **15 сутак.**

t.me/viasnanazirae/406

7.1K viewsJul 25, 2021 at 17:35

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy